благодарит участников, отмечает наиболее эмоциональные, значимые моменты совместной работы, поощряет участников призами. Необходимо отметить, что реконструкция вызывает сильные впечатления у подростков и молодежи. Отзывы участников, проведенных нами реконструкций – учащихся и педагогов – свидетельствуют о сильном положительном эмоциональном впечатлении, об эффективном формировании культурных компетенций, о формировании духовно-нравственных ценностей [2]. Метод реконструкции уникален, в нем эффективно срабатывает психологический механизм интериоризации (Л.С. Выготский), когда через проигрывание социально значимых событий личностью присваивается жизненный опыт, на основе которого формируются ценности.

Литература


1. Белорусские пролайферы рассказали о своей работе со школьниками на большом семинаре по репродуктивному здоровью в Казани. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://vk-cc.com/5yCY – Дата доступа: 04.12.2015.
2. *Лунгуль, А.А.* Формирование общекультурных компетенций у бакалавров педагогического образования при реконструкции народных обрядов/ А.А. Лунгуль Т.А. Бахор, О.Н. Зырянова, В.С. Лобарева // Современные проблемы науки и образования. – 2014. – № 6.
3. *Матузенка А.С.* Асабливасці арганізацыи и правядзення вясельнай абраднасці/ А.С. Матузенка // http://repository.buk.by:8080/jspui/bitstream – Дата доступа: 20.12.2013.
4. *Петривняя, Е.К.* Театр-реконструкция как средство формирования познавательно-эвристических, художественно-концептуальных и ценностных ориентаций. / Е.К. Петривняя. – М.: Центр дополнительного образования, 2015.



***Іваненка Мікалай Міхайлавіч***

*наместнік дырэктара па вучэбнай рабоце ДУА «Вілейская гімназія № 2»*


## Сацыяльна-эканамічныя праблемы грамадства праз прызму хрысціянскіх каштоўнасцей: педагагічны ракурс

Пяцікласнік у адным са сваіх сачыненняў напісаў: «Наша Зямля такая маленькая, але на ёй ёсць усё для шчасця...». Гэтыя словы ўражваюць не столькі дзіцячай мудрасцю аб магчымасці райскага існавання, колькі прынцыпова новым планетарным поглядам. Для дзяцей сярэдзіны прошлага стагоддзя планета Зямля была яшчэ вельмі вялікай. А сёння мы можам назіраць, як па меры «росту» чалавека зямны шар «памяншаецца». Зямля становіцца ўсё больш безабароннай перад тым, для каго на ёй Богам створана ўсё для шчасця. Бяздумная, а лепш сказаць бяздушная «гаспадарлівасць» прывяла нашу цывілізацыю ў тупік: на першы план выходзіць ужо не дабрабыт, а элементарнае выжыванне. Сёння чалавецтва сутыкаецца з мноствам глабальных праблем: палітычных (войны, тэрарызм, гонка ўзбраенняў), экалагічных (забруджванне паветра, вады, зямлі, пагроза знішчэння ўсяго жывога), рэсурсавых (энергетыка, сыравіна, прадукты харчавання, водныя і інш. рэсурсы), дэмаграфічных (перанасяленне Зямлі – з аднаго боку і выміранне хрысціянскіх народаў – з другога), сацыяльна-

эканамічных (вялікае адставанне ў развіцці дзяржаў «трэцяга свету») [5, с.145-146] і многіх іншых. Пра гэтыя праблемы даволі часта вядуцца размовы як сярод простых людзей, так і на самых высокіх дзяржаўных і міжнародных узроўнях. Але пры гэтым рэдка можна пачуць разважанні аб сапраўдных прычынах такога катастрафічнага стану. А прычыны ў бездухоўнасці чалавека. Адам зноў дзёрзка зрывае яблыкі з дрэва пазнання, сілкуецца імі сам, гадуе дзяцей і амаль не задумваецца аб наступствах сваіх учынкаў. Мы забыліся пра словы Хрыста ў адказ д’яблу, які спакушаў Яго ў пустыні: «Не хлебам адным будзе жыць чалавек, а ўсякім словам, якое зыходзіць з вуснаў Божых» [Мф.4.4]. Гэта зусім не азначае, што чалавеку не патрэбны хлеб (матэрыяльныя ўмовы жыцця). Апостал Павел у сваіх пасланнях да Фесаланікійцаў просіць «паважаць тых, хто працуе» [1.Фес.5.12], і, больш за тое, наказвае братам па веры: «…калі хто не хоча працаваць, то няхай і не есць» [2.Фес.3.10]. Матэрыяльная забеспячэнне, багацце само па сабе не з’яўляецца злом, яно – дар Божы на карысць чалавеку [2.59], але ж «кесарава кесару, а Божае Богу» [Мф.22.21], таму не трэба забывацца і пра галоўнае папярэджванне Хрыстова: «Шукайце ж найперш Царства Божага і праўды Яго і гэта ўсё дадасца вам» [Мф.6.33]. Дваццаць год таму, у 1997 годзе, на пасяджэнні ЦК Канферэнцыі Еўрапейскіх Цэркваў у Жэневе генеральны сакратар Канферэнцыі пастар Кіт Клементс, абрысоўваючы накірункі дзейнасці сваёй арганізацыі і даючы «правільны аналіз сучаснага еўрапейскага кантэксту» падкрэсліў: «Еўропа мае патрэбу ў Евангеллі, выказаным у эканамічных тэрмінах. А эканоміка – у тэрмінах Евангелля» [1]. Відавочна, што пасля першай часткі выказвання, другая губляе свой сэнс. Гаварыць пра бізнес, які пастаўлены ў жорсткія ўмовы канкурэнцыі, дзе парушаюцца нават прасцейшыя маральныя нормы, не кажучы пра духоўныя. Сучасны чалавек ужо перастаў абурацца на прапанову яму шкодных і нават небяспечных для жыцця прадуктаў харчавання, такіх жа лекаў, адзення і абутку, тэхнічных сродкаў і інш. Мы набываем пабудаваныя са шкодных матэрыялаў кватэры, небяспечныя для здароўя дзіцячыя цацкі, посуд і інш. Тысячы найменняў разавых рэчаў штодня проста выкідваюцца. Вытворцаў турбуе толькі прыбытак, а спажыўцы бяздумна набываюць усё, што прапануе рэклама, пераўтвараючы зямлю ў агульны сметнік. І толькі адзінкі з тысяч робяць намаганні паўстаць супраць гэтага бязладдзя. Навуковыя дасягненні, высокія тэхналогіі, бурны эканамічны рост – усё гэта магло б стаць гарантам спакойнага, забяспечанага і шчаслівага жыцця, але чалавек трапляе ў матэрыяльна-спажывецкую залежнасць, уцягваецца ў барацьбу за рынкі збыту, рэсурсы і тэхналогіі, прыдумвае ўсё больш грозную зброю і канчаткова губляе спакой. Кожная праблема ад самай маленькай і нязначнай да самай глабальнай, якой бы сферы грамадскага жыцця яна не датычылася – эканамічнай, сацыяльнай, палітычнай ці духоўнай – указвае нам на так званы «чалавечы фактар». А галоўным сярод шматлікіх складнікаў, якімі характарызуецца гэты тэрмін, заўсёды быў і будзе духоўна-маральны стан чалавека,

абумоўлены яго светапоглядам. Існуюць дзве асноўныя светапоглядныя платформы – рэлігійная і атэістычная. Першая выводзіць розум на ўзровень вечнасці, дае чалавеку веру, надзею і любоў. Другая – абмяжоўвае часовасцю існавання і прагматычна дыктуе эгаістычнае «жыві для сябе». У свеце не так многа людзей з высокімі маральнымі нормамі, чые намаганні, маючы правільную светапоглядную матывацыю, маглі б аказваць дзейсны станоўчы ўплыў на сацыяльна-эканамічныя, палітычныя і культурныя працэсы грамадства. Нельга не пагадзіцца з народнай мудрасцю, якая сцвярджае, што «праблемы сучаснасці не ў тым, што мы не можам накарміць бедных, а ў тым, што багатыя ніяк не наядуцца». Сапраўды, чалавек без правільнага духоўна-маральнага выхавання ніколі не зможа нават часткова адмовіцца ад матэрыяльных выгод.

Сістэма адукацыі нашай Рэспублікі робіць значныя намаганні для ўсебаковага развіцця і выхавання падрастаючага пакалення. Штогод рэалізуюцца планы сумесных мерапрыемстваў з Праваслаўнай Царквой, грамадскімі арганізацыямі, установамі культуры і сацыяльнай сферы. Праводзіцца вялікая работа па духоўна-маральным, патрыятычным, працоўным і экалагічным выхаванні. На базе Вілейскай гімназіі № 2 многія гады ажыццяўляюцца праекты ў статусе інавацыйнай пляцоўкі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь па ўзаемадзеянні сям’і і школы, па духоўна-асветніцкай дзейнасці, захаванне хрысціянскіх каштоўнасцей і адраджэнне праваслаўных сямейных традыцый нашага народа. У гімназіі працуе раённы рэсурсны цэнтр па духоўна-маральным выхаванні, у якім сабрана вялікая колькасць спецыяльнай і дзіцячай літаратуры, відэа- і аўдыяматэрыялаў, метадычных распрацовак, праграм, сцэнарыяў розных мерапрыемстваў, вучэбна-метадычных комплексаў па асновах праваслаўнай культуры. Створана экспазіцыя з пяці раздзелаў: «Царкоўны каляндар», «Праваслаўная ікона», «Свяшчэннае Пісанне», «Храм – дом Божы» і «Сям’я – малая царква». Афармлены этнакуток, збіраюцца матэрыялы для музея этнаграфіі, адраджаюцца народныя рамёствы, праводзяцца майстар-класы па народнаму танцу і спевах. Працуе музей воінаў-інтэрнацыяналістаў. Хутка будзе адчынены раённы рэсурсны цэнтр па асновах бяспекі жыццядзейнасці. Рэалізуюцца шматлікія даследчыя, дабрачынныя і творчыя праекты, праводзіцца работа па адраджэнні народнага лялечнага мастацтва, традыцыйнага касцюма Вілейскага строю. Мінскім інстытутам развіцця адукацыі выпушчаны зборнік матэрыялаў «Духоўна-маральныя асновы падрыхтоўкі вучняў да сямейнага жыцця» з вопыту работы гімназіі. Падрыхтаваны цыклы лекцый і практычных заняткаў, якія праводзяцца для настаўнікаў на курсах павышэння кваліфікацыі у Мінскім абласным інстытуце развіцця адукацыі; арганізуюцца лекторыі і гутаркі для бацькоў і вучняў. Настаўніцкая грамадскасць заклапочана праблемамі выхавання ў сучасных умовах і робіць усё магчымае для станоўчага ўплыву на дзяцей і падлеткаў. Тым не менш, праблемы растуць і паглыбляюцца. Ні для каго не сакрэт, што школа па сіле выхаваўчага ўздзеяння стаіць далёка не на

першым месцы. Перад ёй – сям'я, сродкі масавай інфармацыі (інтэрнэт) і сацыяльнае акружэнне. Вялікую ролю ў справе выхавання адыгрывае Царква. Сама яе наяўнасць у населеным пункце аказвае станоўчы ўплыў на жыхароў. Але царкоўнае выхаванне можа быць дзейсным толькі для тых, хто прыходзіць у храмы. Калі ж звярнуць увагу на вядомы факт, што прыхаджан прыкладна ўсяго 3 % ад праваслаўнага насельніцтва, то можна сказаць, што і Царква не мае магчымасці маштабнага ўплыву. Вельмі разумным мне падаецца рашэнне аб'яднаць намаганні школы і Царквы, бо ў гэтым спалучэнні і першая, і другая ў разы павялічваюць свой выхаваўчы патэнцыял. Калі ж гаварыць пра сацыяльны асяродак, то ён амаль цалкам фарміруецца пад уплывам СМІ і асабліва інтэрнэту з яго сацыяльнымі сеткамі. Гіпертрафіраваная ўвага да жахаў, насілля і сэксу ў горшых (не чалавечых) яго праявах прыводзіць дзяцей і падлеткаў да эмацыянальнага выхалашчвання, дэфармацыі поларолевых праяўленняў і міжпалавых адносінаў, што ў будучым можа прывесці да няздольнасці стварыць здаровыя сем'і. Першаснай і асноўнай структурай усебаковага развіцця, выхавання і фарміравання каштоўнасных жыццёвых арыентацый з'яўляецца сям'я. Менавіта яна дае падмурак для далейшага ўспрымання ці адхілення тых прапаноў, якія будуць зыходзіць ад іншых выхаваўчых інстытутаў. На адраджэнне сямейных традыцый, аздараўленне сям'і і ўзнаўленне яе патэнцыялу сёння павінны быць скіраваны асноўныя намаганні грамадскасці. Дзеля гэтага нам патрэбна ўспрымаць сям'ю як цэласную структуру, дзе бацька і маці, у адпаведнасці са сваім адвечным поларолевым прызначэннем, у роўнай адказнасці, выконваюць свае абавязкі. Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на ролю бацькі ў сучаснай сям'і, бо яна прыніжаецца ці наўмысна замоўчваецца. На жаль, нават у асновах сацыяльнай канцэпцыі Рускай Праваслаўнай Царквы, дзе ідзе гаворка пра падтрымку інстытута сям'і, ужываецца збіты тэрмін «мацярынства і дзяцінства» [4,18]. А бацькоўства не трэба падтрымліваць? Асновы сямейнага жыцця на прынцыпах хрысціянскай маралі павінны выкладацца ў сучаснай школе не пазней як з сёмага класа і да выпуску. Для гэтага трэба рыхтаваць спецыялістаў, пісаць і ўдасканальваць праграмы, выдаваць метадычныя дапаможнікі і падручнікі. І ў плане фарміравання асобы гэта школьны прадмет стаў бы галоўным. Выклік глабалізацыі патрабуе ад нас належнага адказу. Хвалюючыся за мірнае жыццё на зямлі, за паляпшэнне сацыяльна-эканамічных і культурных умоў, за правы чалавека, мы не павінны забывацца аб прыярытэце рэлігійных каштоўнасцей [4,86]. Паважаючы светапоглядны выбар нерэлігійных людзей і іх права ўплываць на грамадскія працэсы, неабходна кіравацца хрысціянскім светапоглядам у працэсе прыняцця важных грамадскіх рашэнняў і выхоўваць нашых дзяцей дбайнымі гаспадарамі на сваёй зямлі.

1. Заседание Центрального комитета Конференции Европейских Церквей [Электронный ресурс] / Русская Православная Церковь. Архив официального сайта Московского патриархата 1997-2009. – 2.02.1998.
2. *Маслов Н. В.* Толковый педагогический словарь: Духовные и нравственные понятия / Н.В. Маслов. – М: Самшит-издат, 2015. – 880 с.
3. Новы Запавет Госпада нашага Ісуса Хрыста / Пераклад з грэчаскай на сучасную беларускую мову Біблейскай камісіі Беларускай Праваслаўнай Царквы; адказны рэдактар перакладу протаіерэй Сергій Гардун. – Мінск: Прыход Свята-Петра-Паўлаўскага сабора: Медыял, 2017. – 544 с.
4. Основы социальной концепции Русской Православной Церкви / Юбилейный архиерейский собор Русской Православной Церкви. – М., 2000. – 88 с.
5. *Самыгин С.И.* Философия для студентов вузов / С.И. Самыгин [и др.]. – Изд. 6-е. – Ростов н/Д: Феникс, 2008. – 154 с.
6. *Тюкавкин Н.М.* Духовность экономики / Н.М. Тюкавкин / Кафедра экономики Самарского государственного университета. // https://cyberleninka.ru/article/n/duhovnost-ekonomiki. – Дата доступа: 17.12.2017.

***Сметанин Илья***
*директор Центра по трудоустройству выпускников детских домов и молодых людей с ограниченными возможностями ("Центр по трудоустройству «Работа-і»), СПб.*
***Нарижняя Татьяна***
*старший консультант по сопровождаемому трудоустройству ("Центр по трудоустройству «Работа-і»), Санкт-Петербург*

# О помощи в трудоустройстве молодым людям с особенностями развития

Что мешает работодателям трудоустраивать людей с инвалидностью? Есть три основные причины, которые останавливают работодателей: на какие позиции брать инвалидов, как готовить коллектив при выходе сотрудника с инвалидностью и какие риски и обязательства у компании по условиям труда. Центр по трудоустройству «Работа-і» — самостоятельный проект благотворительного фонда «Рауль», главная задача которого, помочь в поиске работы молодым людям с особенностями развития, выпускникам детских домов и коррекционных школ. Возраст ребят от 16 до 29 лет, и самым главным условием обращения в Центр является отсутствие опыта работы. До того момента, когда начинается закрытие реальной вакансии, проводится подготовительная работа, которая помогает максимально проверить мотивацию и определить зоны профессионального интереса наших подопечных. Это различные тренинги, мастер-классы и стажировки. Наши кандидаты претендуют на начальные позиции в рознице, логистике, сервисе. При этом Центр работает только с теми работодателями, которые готовы выделить наставника на весь период адаптации. В свою очередь, мы предлагаем трудоустроенным кандидатам сопровождаемое трудоустройство от 6 месяцев и более. За период, начиная с 2013 года, успешно трудоустроились более 220 молодых людей нашей целевой аудитории, из них около 150 молодых людей с инвалидностью. Наш опыт работы показывает, что если проведена правильная работа по профориентации и